14. РГИА в Санкт-Петербурге. Ф. 1266. Д. 12. Журнал Комитета западных губерний 1833 г.

15. РГИА в Санкт-Петербурге. Ф. 1266. Д. 22. Журнал Комитета западных губерний 1838 г.

16. РГИА в Санкт-Петербурге. Ф. 1266. Д. 24. Журнал Комитета западных губерний 1839 г.

17. РГИА в Санкт-Петербурге. Ф. 1266. Д. 26. Журнал Комитета западных губерний 1840 г.

18. РГИА в Санкт-Петербурге. Ф. 1266. Д. 36. Журналы Комитета западных губерний 1845, 1846, 1847 и 1848 гг.

19. [Семашко, И.] Записки Иосифа митрополита Литовского, изданные Императорской академией наук по завещанию автора: в 3 т. / И. Семашко. – СПб.: Тип. импер. АН, 1883. – Т. 1. – 745 с.; Т. 2. – 786 с.; Т. 3. – 1432 с.

20 [Смарагд] Письма епископа Полоцкого Смарагда к князю Н.Н. Хованскому, генерал-губернатору Смоленскому, Витебскому и Могилёвскому // Русский архив. – 1891. – Кн. 8. – С. 427–440.

21. Филатова, Е.Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860: дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Е.Н. Филатова. – Мінск, 2001. – 159 с.

22. Янковский, П. Записки сельского священника / П. Янковский. – Минск: Свято-Петрово-Павловский собор, 2004. – 380 с.

## У вытокаў беларускага нацыянальнага руху

Літвіноўская Ю. І. г. Мінск, БДУІР

Адносна працэса фарміравання сучасных еўрапейскіх нацый у гістарычнай літаратуры існуе два асноўныя пункту гледжання. Згодна першага − сучасныя еўрапейскія народы маюць старажытнае паходжанне і прынцыповыя адрозненні ў этнічнай самасвядомасці нашага сучасніка і жыхара, напрыклад, сярэднявечча адсутнічаюць.

Прыхільнікі іншых поглядаў сцвярджаюць, што сучасныя нацыі − вынік распаду традыцыйнага аграрнага грамадства і ўзнікнення новага індустрыяльнага, капіталістычнага грамадства. Пераўтварэнні якія пры гэтым адбываліся ў эканамічным, палітычным і сацыяльным жыцці садзейнічалі развіццю сучаснай

нацыянальнай свядомасці і яна карэнным чынам адрозніваецца ад свядомасці жыхароў мінулых стагоддзяў. Працэс фарміравання сучасных нацый − гэта XIX–XX стагоддзі.

Дакранаючыся да гэтай праблемы, беларускі гісторык Сяргей Токць, у прыватнасці, прыводзіць словы польскага даследчыка Фларыяна Знанецкага, які заўважыў, што яшчэ, напрыклад, "… у канцы васямнаццатага стагоддзя большасць жыхароў розных рэгіёнаў Італіі, ад П'емонта да Сіцыліі, не ўсведамлялі сабе факту, што ўсе яны з'яўляюцца італьянцамі. Падобна, людзі, што жылі на тэрыторыі, якая разлеглася ад Прусаў да Рэйнскай вобласці і ад Гановера да паўднёвай Баварыі, не лічылі сябе немцамі. Нават у дваццатым стагоддзі сяляне некаторых еўрапейскіх абшараў не мелі паняцця, што належаць да якой-небудзь этнічнай супольнасці больш шырокай, чым лакальная супольнасць" [10, с. 69].

Нацыятворчы працэс у розных рэгіёнах Еўропы меў значныя адрозненні. Калі ў Заходняй Еўропе, як пісаў польскі даследчык Юзаф Хлебоўчык ён адбываўся па схеме дзяржаўная супольнасць – моўная супольнасць – нацыянальная супольнасць, то станаўленне цэнтральна-усходнееўрапейскіх нацый развівалася некалькі іншым шляхам: моўная супольнасць – нацыянальная супольнасць – дзяржаўная супольнасць [10, с. 69–70].

Можна пагадзіцца з існуючым у гістарычнай літаратуры пунктам гледжання які падзяляе нацыятворчы працэс на два асноўныя этапы: культурна-моўны і палітычны. Гэты падыход, нам здаецца, у дастатковай меры адлюстроўвае беларускую рэчаіснасць. У сувязі з гэтым падыходам у гісторыі беларускага нацыянальнага руху можна вылучыць два галоўныя перыяды 1794–1863 гг. і 1863–1918 гг.

У першы перыяд адбываюцца пераважна моўна-культурныя працэсы: вывучэнне народнай мовы і культуры, звычаяў, гістарычнай мінуўшчыны беларусаў; чыняцца спробы наладзіць працэс кнігадрукавання на беларускай мове, выдання слоўнікаў, фальклорных зборнікаў; зараджаецца новая беларуская літаратура. Мясцовая інтэлігенцыя намагаецца данесці культурныя здабыткі да насельніцтва (галоўным чынам сялян) на народнай мове. Але сярод насельніцтва ў гэты перыяд дамінуючым усё ж застаецца паняцце не нацыянальнай, а тэрытарыяльнай супольнасці.

Паўстанне 1863–1864 гг. і дзейнасць К. Каліноўскага зыгралі этапную ролю ў развіцці беларускага нацыянальнага руху. Упершыню спалучаюцца сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурныя пытанні ў беларускім нацыянальным русе. Упершыню, мабыць і недастаткова гучна, уздымаюцца ўласна беларускія пытанні ў агульнапольскім нацыянальным руху які ў той час быў дамінуючым на Беларусі.

Такім чынам, аб беларускім вызваленчым рухе, як пэўнай рэчаіснасці для якой уласцівы элементы самаўсведамлення, пэўнай арганізаванасці можна весці гаворку з канца XVIII стагоддзя, дакладней з 1794 г. − года паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі. З гэтага моманта пачынаецца працэс яго якаснай эвалюцыі. І ў гэтым плане можна сказаць, што яго пачатковым этапам быў перыяд 1794–1863 гг.

Канец XVIII ст. вельмі знакавы перыяд гісторыі Усходняй Еўропы. На яе абшарах адбыліся змены, якія наклалі свой адбітак на гісторыю народаў, якія яе насялялі, у тым ліку і беларусаў. Гэтыя змены насілі геапалітычны характар і былі павязаны са знікненнем з геаграфічнай карты адной з буйнейшых дзяржаў кантыненту − Рэчы Паспалітай. Гэтая з'ява была вынікам цэлага шэрагу абставін як унутранага развіцця дзяржавы, так і міжнародных абставін.

Беларускія землі з насельніцтвам звыш 3 млн. чалавек аказаліс у складзе Расійскай імперыі і з гэтага часу іх лёс, стан эканомікі і асаблівасці культурнага развіцця цесна звязаны з развіццём Расіі. Гэтую падзею нельга ацаніць адназначна.

На думку аднаго з найбольш значных даследчыкаў айчыннай гісторыі У. Ігнатоўскага "з дзяржавы, ужо разваленай, яна (Беларусь − Ю.Л.) папала ў дзяржаву, каторая таксама пастулова развальвалася. І Расія хварэла тою самаю панска-шляхецкаю хваробаю, ад каторай памерла Рэч Паспалітая" [2, с. 166].

У склад новай дзяржавы Беларусь уступіла ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай 1772, 1793 і 1795 гг., якія ажыццявілі Расія, Прусія і Аўстрыя. Вельмі трывожнымі былі не толькі эканамічнае становішча краю, але і сацыяльныя працэсы, якія мелі месца на беларускай зямлі. Яны былі павязаны са знікненнем са складу беларускага этнасу нацыянальнай феадальнай арыстакратыі. Справа ў тым, што за час існавання Рэчы Паспалітай пераважная большасць беларускай буйнапамеснай і сярэдняй шляхты "ў пагоні

за саслоўнымі прывілеямі і вольнасцямі ў Рэчы Паспалітай выракліся ад роднай мовы, культуры, звычаяў і традыцый свайго народа, прынялі ў якасці роднай польскую мову і культуру і ўрэшце зліліся з польскімі феадаламі ў “адзін народ шляхетны” [1, с. 3].

Змяніўся і нацыянальны склад насельніцтва беларускіх гарадоў. Там пераважала яўрэйскае насельніцтва. Практычна знікла этнічна беларускае купецтва. Усё гэта прывяло да катастрафічнага аслаблення беларускага этнасу.

Даследчыкі адзначаюць, што паланізацыя вярхоў грамадства пазбавіла беларускі этнас і нацыянальнай інтэлігенцыі, якая паходзіла з іх і абслугоўвала найперш іх інтарэсы і патрэбы. Яна таксама паланізавалася, што мела вынікам фальклярызацыю беларускай культуры, бо адзіным захавальнікам і творцам яе заставаўся “просты народ” − сялянства, да частка гараджан, а таксама ніжэйшага духавенства і дробнай шляхты, блізкай па сваім побыце да сялян [1, с. 4].

У 30-я гады ХІХ стагоддзя на Беларусі ўзнікаюць дзесяткі тайных арганізацый, палітычнага, літаратурнага, навукова-культурнага, асветніцкага характара якія фарміруюць дух незалежнасці ў моладзі. Пры гэтым усе яны былі апантаны ідэямі барацьбы за незалежнасць Польшчы. Але сучасныя беларускія даследчыкі адзначаюць, што “… солидаризация белорусов с поль ским национально-освободительным движением замедляла возникновение белорусского национального самосознания. Все, кто стоял … на польских позициях, не смогли освободиться от речьпосполитовского патриотизма. Местный … патриотизм этих людей полностью подчинялся общегосударственному: польский язык и костел были теми цепями, которые связывали жителей Белоруссии с кругом проблем, решаемых освободительными силами Польши” [12, с. 8].

Вядомы беларускі гісторык М. Біч адзначаў, што на фарміраванні беларускай нацыі адмоўна адбіваліся абмежавальныя законы царызму, што датычыліся рассялення яўрэяў. З 1794 г. Беларусь уваходзіла ў рэгіён “яўрэйскай аселасці”. Але і ў межах гэтага рэгіёна яўрэям дазвалялася жыць толькі ў гарадах і мястэчках. Перыядычна праводзілася прымусовае ссяленне яўрэяў з весак і памешчыцкіх маенткаў, дзе яны выступалі ў якасці арэндатараў і займаліся гандлёва-прамысловай дзейнасцю, ў гарады

і мястэчкі. На Беларусь высылаліся яўрэі з Масквы і іншых гарадоў і мясцін цэнтральных губерняў, дзе ім забаранялася жыць. Гэтыя меры садзейнічалі перепаўненню беларускіх гарадоў і мястэчак яўрэйскім жыхарствам, што істотна стрымлівала, а часам і выключала прыток у іх сельскага беларускага несельніцтва, як пралетарызаванага, так і заможнага, буржуазнага. У выніку, удзельная вага беларусаў сярод граджан у канцы XIX ст. складала толькі 14,5 %, а яўрэяў 53,5. Абсалютная большасць беларусаў, амаль 95 % былі сялянамі [1, с. 6–7].

Першыя сімптомы нацыянальнага адраджэння на Беларусі паявіліся на самым пачатку XIX ст., у яго 10–20-я гады. Яны насілі асветніцкі характар. Гэтыя сімптомы былі звязаны з дзейнасцю тайных таварыстваў, арганізаваных студэнтамі Віленскага універсітэта, таварыстваў філаматаў і філарэтаў. Дзейнасць таварыстваў была вельмі значнай з’явай у грамадскім жыцці Беларусі першай паловы XIX ст. Таварыствы ўзніклі сярод студэнтаў адной з лепшых вышэйшых навучальных установ Еўропы.

Мэтай згуртавання, як значылась у статуце, прянятым 1 кастрычніка 1817 г., на першым пасяджэнні таварыства была “узаемадапамога ў паглыбленні адукацыі, у творчым удасканальванні, грамацкая праца для дабра зняволенай Айчыны” [11, с. 9]. Пад Айчынай студэнцкая моладзь Віленскага універсітэта разумела Рэч Паспалітую. Такім чынам, беларускія хлопцы, члены таварыства філаматаў былі перш за ўсе польскімі патрыётамі. Але як пісаў вядомы беларускі даследчык У. М. Ігнатоўскі: “…трэба ўсе ж такі адзначыць, што сярод апалячынай беларускай шляхты ў універсітэце адчуваюцца мясцовыя сымпатыі. Устанаўляецца погляд на Белаусь, як на зусім асобную правінцыю Польшчы, што не подабаецца польскім патрыётам з Варшавы, каторыя з’яўляюцца абаронцамі адзінай і непадзельнай Польшчы.” [2, с. 168].

Частка членаў таварыства паходзіла з апалячанай беларускай шляхты. Будучыню Беларусі, а ў іх разуменні гэта было Вялікае Княства Літоўскае, яны бачылі ў аднаўленні былой Рэчы Паспалітай. Пры гэтым філаматы і філарэты заўседы памяталі, што іх радзіма Беларусь, у іх разуменні “Літва”. На гэтую абставіну ўказвалі і царскія следчыя, якія вялі разбіральніцтва па справе

таварыства філарэтаў. Яны “ясно обнаруживали, что под словом приверженности к своему краю разумелось не приверженность к Российской империи вообще, но только к губерниям, составляющим виленский университетский округ…” [11, с. 20].

Гэтая акалічнасць, дазваляе гаварыць аб зараджэнні сярод студэнцкай моладзі ідэй беларускага нацыянальнага адраджэння. Гурткі віленскай моладзі былі толькі першым крокам на шляху культурна-нацыянальнага адраджэння беларусаў, у справе станаўлення беларускай культурнай традыцыі.

Закранаючы пытанне захавання беларускай адметнасці ва ўмовах знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі вядомы беларускі даследчык Л. Лыч пісаў, што палітыка царызму ва ўсіх сферах духоўнага жыцця не адпавядала этнакультурным інтарэсам беларусаў. Афіцыйна дэкларавалася, што з беларусаў трэба фарміраваць людзей, якія нічым не адрозніваліся б ад рускіх. Гэтага напрамку цверда прытрымлівалася і Руская праваслаўная царква на Беларусі, будуючы тут усю сваю дзейнасць выключна ў духу рускіх нацыянальна-культурных традыцый. Рускай сістэме адукацыі, рускай мясцовай адміністрацыі, Рускай праваслаўнай царкве ўдалося вельмі многае зрабіць па размыванню этнакультурнай адметнасці беларусаў і растварэнні іх сярод рускай нацыі. Вось у такіх умовах зарадзілася і адбывалася фарміраванне дзяржаўнай канцэпцыі заходнерусізму, сутнасць якога зводзілася да поўнага адмаўлення этнічнай самабытнасці беларусаў і атаясамлявання іх з рускімі [6, с. 35–37].

Тэорыя “заходнерусізму” пачала складвацца ў першай палове XIX ст. У яе аснове ляжалі спробы даказаць, што беларусы і рускія гэта адзін народ, беларуская мова з’яўляецца дыялектам рускай мовы, тэорыя адмаўляла беларусам у праве мець сваю гісторыю і культуру. Яе галоўнае прызначэнне даказаць правы Расійскай імперыі на валоданне беларускімі землямі і спрыяць русіфікацыі краю. “Заходнерусізм” абапіраўся на афіцыйную дактрыну сфармуляваную ў 1830-я гады міністрам асветы С. Уваравым у трыядзе “праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць”.

Працэсы культурна-нацыянальнага адраджэння, якія пачалі развівацца на Беларусі з пачатку XIX ст. гэта былі першыя зярняты кінутыя ў глебу на ніве фарміравання нацыянальнай свядомасці беларусаў. Разам з тым неабходна адзначыць, што яны не ўзніклі на

пустым месцы. Гэтыя працэсы былі выкліканы да жыцця агульным станам тагачаснага грамадства, тымі тэндэнцыямі, якія былі яму ўласцівы, характарам палітычнай ідэалогіі. Канец XVIII–пачатак XIX ст. час, калі на Беларусі, пад уздзеяннем еўрапейскіх падзей актывізуецца унутрыпалітычнае жыццё, пачынаюць стварацца грамадска-палітычныя аб'яднанні [7, с. 48; 9, с. 6–7].

Культурна-нацыянальныя адраджэнскія імкненні беларускага народа найбольш відавочна і паслядоўна праявіліся ў новай беларускай літаратуры. Пісьменнікі станавіліся не толькі выразнікамі аб'ектыўнага працэсу абуджэння народа, але і яго абуджальнікамі. Знайдзеная ў 1973 г. у архівах Ягелонскай бібліятэкі ў Кракаве паэма "Мачыха", падпісаная псеўданімам "Адэля з Устроні" і пазначаная 1850 г., сведчыла аб тым, што ўжо да 50-х гадоў у беларускай грамадскасці выспела ідэя звароту да народнай мовы, да стварэння на ей эстэтычных каштоўнасцей, да выяўлення нацыянальна-вызваленчых, народалюбівых імкненняў [4, с. 109].

Першыя творы на беларускай мове мы знаходзім ужо у Яна Чачота. У 1819 г. ен напісаў свой першы верш на беларускай мове. Увогуле яго пяру належыць каля сарака арыгінальных твораў. Але ў яго яшчэ былі сумненні наконт таго, ці стане гэтая мова літаратурнай [4, с. 10]. 50-я гады XIX стагоддзя наогул можна назваць часам, калі адбыўся першапачатак уласна беларускага літаратурнага руху ў Беларусі. Центральнай постаццю ў ім стаў В.І. Дунін-Марцінкевіч − беларускі дудар, як ен сам сябе назваў. І ў гэтай саманазве алюстроўвалася яго асобная грамадская пазіцыя, характар літаратурнай і культурнай дзейнасці.

Працэс станаўлення культурна-нацыянальнага адраджэння адбываўся ў вельмі няпростых умовах. Надзвычайна цяжкай была сітуацыя з выкарыстаннем беларускай мовы. Усе вышэйшыя класы грамадства, адміністрацыя, духавенства ставіліся да яе зняважліва, як да мовы народных нізоў, як да чагось некультурнага, хамскага. Адсутнічалі беларускамоўныя газеты і часопісы. Грамадская думка як прарасійская, так і прапольская сцвярджала аб адсутнасці беларусаў як этнасу і ў большасці выпадкаў, адмоўна ставілася да спроб літаратурнай творчасці на беларускай мове [1, с. 10]. У гэтых умовах сам зварот пісьменнікаў да беларускай мовы быў мужным паступкам, выражэннем пратэсту супраць нацыянальнай

дыскрымінацыі. Абуджэнне нацыянальнай свядомасці беларусаў праяўлялася ва ўзросшэй цякавасці да гісторыі свайго народа, фальклору, звычаяў і абрадаў, геаграфіі краю, яго вызначных мясцінах.

Падводзячы вынікі развіццю сацыяльна-палітычнах працэсаў на Беларусі ў перыяд 1794–1863 гг. неабходна адзначыць, што на палітычнай ніве тут панавалі прапольскія патрыятычныя настроі. У іх аснове была барацьба за адраджэнне Рэчы Паспалітай, польскай у сваей аснове дзяржавы ў межах 1772 г. Беларусь і Украіна удзельнікамі патрыятычнага руху разглядаліся выключна як "крэсы ўсходнія" Рэчы Паспалітай.

Аднак ў нерах польскага нацыянальна-вызваленчага руху паступова фарміруецца яго "беларуская складавая". Гэта адбываецца праз культурна-асветніцкую дзейнасць вывучэнне мовы, гістарычнай мінуўшчыны беларусаў, спробы ўзнавіць кнігадрукаванне на роднай мове, выданне слоўнікаў, фальклорных зборнікаў, зараджэнне новай літаратуры на беларускай мове. Такім чынам ідзе працэс станаўлення беларускай культурнай традыцыі. Паступова ўсвядамляецца ўласная этнакультурная індывідуальнасць беларусаў.

Паўстанне К. Каліноўскага было апошнім значным сумесным выступленнем за аднаўленне дзяржаўнасці на землях былой Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага. Стала відавочным, што нацыянальна-вызваленчы рух у Польшчы і Беларусі ўжо не месцяцца ў адным рэчышчы, у кожнага з іх фарміраваліся свае мэты і ўласны шлях. У сваю чаргу літвінскі патрыятызм замяшчаўся патрыятызмам беларускага нацыянальнага руху. Справа паўстання не прапала бясследна, яна будзіла да барацьбы за свабоду і незалежнасць наступныя пакаленні.

Апісваючы эвалюцыю вызваленчага руху на Беларусі адзін з яго арганізатараў і ідэолагаў Антон Луцкевіч так ацэньваў пачатковы этап: "Аглядаючыся на гісторыю беларускага адраджэння, мы бачым доўгі сцяг іменьняў, што адзначаліся на працягу XIX сталецьця як працаўнікі на беларускай ніве. Аднак ўсе яны былі лішне слабыя, каб стацца інтэлектам нашага народу, былі адзінкамі. – А дзеля выпаўненьня функцыі нацыянальнага інтэлекту патрэбна была сільная сваей чысленасьцю і культурнасьцю

ітэлігенцыя. Якімі б волатамі інтэлекту і волі яны ні былі, а ўзятая імі на сябе задача была ім не пад сілу.

Гэта ня значыць, быццам іх праца была дарэмнай. Не: "gutta cavet lapidem non vi, sed saepe cadente" (кропля прабівае камень ня сілай, а частымі ўдарамі), – і кіданыя імі зярняты, падаючы на народную глебу, не засыхалі, а толькі не маглі зараз узысьці. Дзеля гэтага былі патрэбны асаблівыя варункі, варункі, пры каторых магла бы вытварыцца новая народная ітэлігенцыя, – народная, значыцца, зьвязаная з народам, выяўляючая яго душу, яго думкі і жаданьні, прамаўляючая яго мовай, як сваей роднай" [5, с. 115–116].

Падзеі першай паловы XIX ст., як адзначае Алесь Смалянчук, моцна паўплывалі на далейшую эвалюцыю працэсу культурнага накаплення. Адмена прыгоннага ладу і паўстанне 1863–1864 гг. на пэўны час прыпынілі працэс дэмакратызацыі грамадства Беларусі, які генетычна звязаны з нацыянальным Адраджэннем.

**Выкарыстаная літаратура**

1. Біч, Міхась. Беларускае адраджэнне ў XIX–пачатку XX ст. / Міхась Біч. – Мінск, Навука і тэхніка, 1993. – 30 с.

2. Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / І.М. Ігнатоўскі. – Мінск, Беларусь, 1991. – 192 с.

3. Каўка, Аляксей. Беларускі вызваленчы рух. Спроба агляду / Аляксей Каўка // Спадчына. – 1991. − № 5. – с. 5–10.

4. Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. У 2 частках / А.А. Лойка. – Мінск, Вышэйшая школа, 1989. – Частка 1. – 316 с.

5. Луцкевіч, Антон. Да гісторыі беларускага руху / Антон Луцкевіч. – Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства; Вільня, Інстытут беларусістыкі, 2010. – 345 с.

6. Лыч, Л. Праблемы захавання беларускай адметнасці ў славянскай супольнасці народаў / Л.Лыч // Нацыянальныя пытанні. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацыі» 1 сесія – 21–25 мая; 2 сесія − 4–7 снежня, Мінск, 2000 г. – Мінск, Беларускі кнігазбор, 2001. – с. 33–42.

7. Сакалова, М. Пачатак ліберальнага руху ў Беларусі / Мар'яна Сакалова // Штогоднік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, 1999. – Мінск, 1999. – с. 48–56.

8. Смалянчук, А. Да пытання аб ролі палітычнай ідэалогіі ў развіцці беларускага нацыянальнага руху ў 19 – пачатку 20 ст. / Алесь Смалянчук // Гістарычны альманах. – Гародня, 1999. – Т. 2. – с. 3–19.

9. Соколова, М.А. Общественные объединения и движения как факторы формирования гражданского общества в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.) / М.А. Соколова. – автореферат дис. на соиск. уч. ст. канд. ист. наук. – Минск, 2000. – 20 с.

10. Токць, Сяргей. Беларускі нацыянальны рух XIX – пач. XX ст. у кантэксце нацыянальных рухаў народаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы / Сяргей Токць // Нацыянальныя пытанні. Матэрыялы III міжнароднага кангрэса беларусістаў. – Мінск, Беларускі кнігазбор, 2001. – с. 68–76.

11. Філаматы і філарэты. Зборнік. – Мінск, Беларускі кнігазбор. – 1998. – 400 с.

12. Хаустович, Н.В. Белорусское литературно-общественное движение в 30–40-е годы XIX столетия / Н.В. Хаустович. – автореферат дис. на соиск. уч. степени канд. филол. наук. – Минск, 1993. – 19 с.

## Светское и религиозное сознание в деятельности просветителей Беларуси периода Средневековья, Возрождения, Реформации и Контрреформации

Лойко А. И. г. Минск, БНТУ

В период средневековья белорусская культура находилась в уникальном процессе трансформации религиозного сознания из традиции политеизма в традицию монотеизма [1]. Монотеистическую религию представляло христианство восточного обряда. Политеистическая религия рассматривалась княжескими властями Полоцка, Турова, Смоленска как языческая. Трансформации религиозного сознания происходили на фоне формировавшейся народной белорусской культуры. Ее ключевые этнические признаки были обнаружены Е.Ф. Карским в текстах торговых соглашений Смоленска